Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 14 Вільня, Чацьвер, 23 Красавіка 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Камунікат.

Прэзыдыюм Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні гэтым паведамляе ўсе беларускія арганізацыі і інстытуцыі, што ён згодна з Рэгуляімінам прыступіў да абнаўленьня Беларускага Нац. К-ту на 1931-32 год.

1) Дзеля гэтага ўсе беларускія арганізацыі і інстытуцыі павінны да дня 3 траўня с. г. выдэлегаваць сваіх прадстаўнікоў у Нац. К-т на 1931-32 год: палітычныя па 3-х, а ўсе іншыя па 2-х, паўнамоцтвы каторых з дакладнымі адрасамі прадстаўнікоў перасылаць у Прэзыдыюм Б. Н. К-ту да дня 5 траўня с. г.

2) Тыя беларускія народныя арганізацыі, якія не належаць да Нац. К-ту, а жадалі-б прыняць учасьце ў агульна беларускай рэпрэзэнтацыі, згодна з арт. 2 Рэгуляміну Б. Н. К. павінны да дня 5 траўня с. г. падаць заяву Прэзыдыюму Нац. К-ту аб уступленьні ў Беларускі Нац. Камітэт.

3) Прадстаўнікі беларускіх арганізацыяў, выдэлегаваныя ў Нац. К-т на 1931-32 год, павінны сабрацца на агульны сход абноўленага К-ту, які адбудзецца у чацьвер 14 траўня с. г. а гадзіне 11 дня ў памешканьні: — Людвісарская 1—19 у Вільні.

Вільня, дня 20 красавіка 1931 г. Прызыдыюм Бел. Нац. К-ту.

„Rerum Novarum“.

(Да ідэолёгіі Б.Х.Д.)

У грамадзкім жыцьці людзей вялікую, часта пераважаючую ролю, ігрaе ідэолёгія, сьветагляд чалавека, ці прасьцей кажучы, тыя аснаўныя думкі чалавека, у якіх ён выражае сваe адносіны да ўсяго жыцьця, да яго аснаўнога сэнсу і значэньня.

Мы ў сваей грамадзкай працы трымаемся, як ведама, сьветагляду хрысьціянскага ў агульнасьці і тых хрысьціянска-грамадзкіх думак, якія з асновы прыроды і хрысьціянства высунуў папа Лявон XIII у сваей слаўнай на ўвесь сьвет энцыкліцы „Рэрум Новарум“.

У гэтай справе пад загалоўкам тэй-жа энцыклікі спатыкаем у „Chryścijanskaj Dumcy“ (10.IV.1931, № 7) стацьцю, якую бадай у цэласьці тут зьмяшчаем:

„15 траўня 1891 г.—чытаем у „Хр. Д.“ —вялікі папа Лявон XIII выдаў энцыкліку (ліст да хрысьціян усяго сьвету, якая пачынаецца славамі „Рэрум Новарум“ і дзеля гэтага сяньня ўся так і называецца. Сёлета ў траўні месяцы, як бачым, ад часу выданьня гэнай энцыклікі мінае ўжо 40 гадоў. З прычыны гэтай рэдкай і важнай гадаўшчыны ўжо ад пачатку сёлетняга году шмат дзе ў Эўропе, а такжа і ў Амэрыцы ладзяць адпаведныя ўрачыстыя акадэміі, рэфэраты, лекцыі іім пад., а шмат дзе на сьвеце да гэтага рыхтуюцца...

Энцыкліка „Рэрум Новарум“ разважае аб справе работніцкай, ці прасьцей і шырэй кажучы — аб тым, якія павінны быць адносіны між капіталам і працай.

А справа гэта вось у чым. У канцы 18 сталецьця людзі прыдумалі машыны, аткрылі электрычнасьць, знайшлі шмат чаго новага ў навуцы хіміі і гэта ўсё застасавалі да жыцьця прамысловага, фабрычнага. Цяпер ужо ўсё тое, што дагэтуль выраблялася перавper рукамі і за што работнікі зараблялі сабе на хлеб, пачала выраблядь машына — хутчэй, лепш і танней. Такім чынам паявілася шмат людзей беззработных, дужа абнізілася вартасьць працы работніка, вялікія капіталы (багацьці) пачалі награмаджацца ў руках нямногіх, а сярод шырокіх работніцкіх масаў пачала шырыцца страшэнная галіта.

Гэтак паявілася так званая работніцкая справа, па сяньняшняму — соцыяльнае пытаньне, ці проста кажучы — справа адносін між работнікам і фабрыкантам, між працай і капіталам, справа агулам грамадзкай справядлівасьці.

Вось-жа рожныя людзі па рожнаму ўзяліся за разьвязку гэтага вялікага пытаньня, гэтай нязвычайнай, з рожных поглядаў, справы. Каля яе паднялася вялікі спор лепшых і разумнейшых людзей рожных вызнаньняў і народнасьцяў, бо справа гэта з натуры сваей сталася міжнароднай, агульналюдзкай; яна паяўлялася там, дзе пачынаў паяўляцца асабліва вялікі фабрычны промысел.

І так адны (Ле Пляй) уважалі, што гэту справу можа разьвязаць толькі хрысьціянскае міласэрдзе, гэта знача, што ў імя любові трэба прасіць капіталістых, каб яны больш помнілі аб долі работніка, дык яны напэўна свой абавязак споўняць.

Другія ўзноў (дэ Мун, Кэттэлер) не верачы ў тое, што капіталісты паслухаюць заклiку любові да іх і сапраўды стануцца міласэрнымі, дамагаліся, каб дзяржава павагай сваей брала работніка пад сваю апеку і змушала капіталістых да справядлівых адносінаў да работнікаў, а так-жа, каб работнікі арганізаваліся ў свае адумысловыя арганізацыі і каб такжа як найбольш працавалі над сваей прасьветай і над паглыбленьнем у сабе жыцьця рэлігійнага і маральнага.

Іншыя ўзноў, так званыя лібэралы (Сміс і яго пазьнейшыя староньнікі), даказвалі, што работніцкая справа ўлагодзіцца толькі тады, калі ніхто не будзе ўмешвацца ў справы як работніка, так і капіталістаў, калі будзе дана поўная свабода вольнай канкурэнцыі між працай і капіталам.

А яшчэ іншыя (Маркс, ад якога вядуць свой пачатак соцыялісты і камуністы), каб дабіцца справядлівасьці для работнікаў, дамагаліся скасаваньня прыватнага капіталу і агулам прыватнай уласнасьці, каб багацьце замест быць у вадных руках, ці ў руках нямногіх (супалкі), было ўласнасьцяй агульнанароднай ці дзяржаўнай.

Спор гэты ўсьця-ж завастраўся як у Эўропе, так і ў Амэрыцы. Урэшце тагочасны папа Лявон XIII падаў свой голас, як гэту справу можна і трэба разьвязаць.

Вось-жа у гэнай энцыкліцы прадусім адкідаецца соцыялізм і комунізм, бо яны, касуючы права чалавека да ўласнасьці, якое чалавеку належыцца з натуры, гэтым самым касуюць галоўную падставу кожнага грамадзкага ладу.

Адкідае такжа папеская энцыкліка і лібэралізм, бо ён спрые яшчэ больш ненатуральнаму падзелу матэр'яльнага багацьця і работнікаў, як слабейшых у такім грамадзкім ладзе, крыўдзе яшчэ больш.

Энцыкліка прызнае права дзяржаве (хоць, праўда, агранічанае) умешвацца ў справу жыцьця грамадзкага і спыняць імкненьні капіталістых да крыўджаньня работнікаў.

Энцыкліка падкрэсьлівае, што соцыяльная справа — гэта справа не міласэрдзя, а прадусім справядлівасьці, гэта знача, што капіталісты маюць ісьці насустрэч работнікам не з ласкі сваей, але з прыроднай справядлівасьці, якая вымагае, каб работнік меў адпаведны, справядлівы заработак за сваю працу, каб хваціла яму на прызваітае пражыцьцё самому, сваей сям'і і на ўзгадаваньне сваіх дзяцей прынамсі адпаведна да свайго стану.

Урэшце энцыкліка падчоркіvae права работнікам да прафэсыянальных работніцкіх арганізацыяў дзеля абароны сваіх праваў.

Галоўная думка ў папескай энцыкліцы— гэта імкнуцца да таго, каб як найбольш людзей на сьвеце мелі сваю прыватную уласнасьць, якая ёсьць найздаравейшай, бо прыроднай падставай грамадзкага ладу.

У аснову-ж гэтай думкі вялікі папа кладзе навуку Хрыстуса. У аснове лібэралізму і соцыялізму ці комунізму ляжыць матэр'ялізм, гэта знача, што староньнікі гэтых поглядаў апрача свайго дачаснага, цялеснага дабрабыту нічога іншага на сьвеце не бачаць. Вось-жа папа Лявон XIII у сваей энцыкліцы зварачвае людзей увагу на тое, што чалавек апрача патрэбаў чыста матэр'яльных, мае патрэбы і заданьні чыста духовыя і нават надпрыродныя. Вялікі папа нам прыпамінае і тлумача, што поўным уласьнікам матэр'яльнага на зямлі багацьця ёсьць Бог, а мы зьяўляемся толькі яго часовымі валадарамі ці лепш — ужыткоўнікамі, што гэтыя матэр'яльныя багацьці — гэта не мэта наша, а толькі сродкі, якія вядуць нас да нашай мэты апошняй, да Бога, што прыватная уласнасьць абавязковая для правідлоўнага жыцьця, але яна павінна быць агранічана патрэбамі ўсяго грамадзянства. „Валаданьне — кажа Лявон XIII за сьв. Тамашом Аквінскім — павінна быць прыватнае, але карыстаньне супольнае“.

Да мэты гэтай, да разьвязаньня соцыяльнага пытаньня, як вуча нас папеская энцыкліка, вядуць: (Царква) Касьцёл, які мае нас вучыць і гадаваць, а мы павінны старанна карыстаць з яго навукі і паводле гэтай навукі жыць, далей — дзяржава, якая сваей сілай і павагай павінна бараніць слабейшых ад крыўджаньня іх багацейшымі і гэтым самым сільнейшымі і ўрэшце — вольнасьць работніцкіх арганізацыяў, якія павінны рупіцца аб сваім лёсе і старацца лагодзіць і ліквідаваць конфлікты і непаразуменьні між рожнымі клясамі.

Як бачым, сапраўды вялікую падаў навуку папа. Гэта віцаць асабліва сяньня, калі работніцкая справа і агулам справа соцыяльнай справядлівасьці па 40 гадох усьцяж актуальная, усьцяж жывая, неразьвязаная і калі ўсе дасюлешнія спробы развязаньня яе на асновах матэр'ялізму, памінуўшы навуку Хрыстуса,... да пажаданых вынікаў не давялі.

Лібэралізм давёў да вайны і да рэвалюцыі. Марксызм у Расеі давёў да няволі таго, каго асвабадзіць браўся.

Астаецца толькі сьвету вярнуцца пад апякунчыя крыльлі Хрыстуса. І мы верым, што людзі, выпрабаваўшыя свае ўласныя агранічаныя сілы, да мэты не вядучыя, прыдуць сюды, прывядзе іх сюды жыцьцё само.“

Гэтак канчае сваю цікавую стацьцю аб грамадзкай ідэале „Хр. Думка“.

І сапраўды, людзі ў сваім грамадзкім жыцьці церпяць пераважна ад таго, што сьвятла дзеля зразуменьня і разьвязаньня грамадзкіх злыбядаў шукаюць не ў вечных асновах Хрысьціянства, а ў выдуманых праз сябе вузкіх і сьляпых завулках. Ад гэтай грамадзкай хваробы, дзякуючы рожным аб-

ставінам, мо больш як іншыя народы, цярпім мы беларусы.

Дык вось-жа, як паказала дасюлешняе беларускае жыцьцё, нічога нам, як праваслаўным, так і каталіком не астаецца, каб дайсьці да поўнага свайго і грамадзкага і культурнага адраджэньня, як толькі грамадой стаць пад сьцяг Хрыстоў. Праўда, пад гэтым сьцягам шмат ужо нас і стаіць і працуе, — трэба толькі йшчэ больш сьмеласьці, больш разгону. Верым, што прыйдзе хутка і да гэтага...

Адведзіны Вільні ўніяцкім біскупам М. Чарнэцкім.

Дня 18 гэтага м-ца прыехаў у Вільню, як Апостальскі Візытатар цэркваў усходняга абраду, біскуп Мікалай Чарнэцкі. Гэтага самага дня адведаў ён царкву усходняга абраду ў Вільні, пры вуліцы Савіч, дзе быў спатканы пробашчам гэтай царквы айцом Мацэвічам. Айцец Мацэвіч прывітаў біскупа кароткай прамовай у расейскай мове, выражаючы надзею, што пад кіраўніцтвам новага ўладыкі справа ўніі набярэ большай сілы ў сваім разьвіцьці.

Назаўтра, у нядзелю, пры вялікім ліку веручых і цікавых, адбылася ўрачыстая літургія, падчас каторай пяяў царкоўны хор усходнія славянскія малітвы. Падчас літургіі прамаўляў біскуп Чарнэцкі, ужываючы ў перамешку трох моваў: беларускай, польскай і расейскай. Пасьля літургіі даваў народу Апостальскае багаславенства.

Падчас усяе гэтае ўрачыстасьці з аднаго боку кідалася ў вочы вялікае зацікаўленьне віленскага грамадзянства справай уніі, а з другога боку — ўжываньне біскупам пераважна расейшчыны. Як першы факт для ўсіх зразумелы, — бо справа ўніі мае для нашага народу вялікае значэньне, то другі факт хіба толькі можна вытлумачыць тым, што біскуп Чарнэцкі яшчэ ня знае беларускай мовы.

Але да справы ўніі, як вельмі жывучай і важнай для нашага краю, мы яшчэ вернемся ў адным з наступных нумароў нашай газэты.

Чытайце і пашырайце

,,Беларускую Крыніцу"!

З Беларускага жыцьця.

Абнаўленьне Беларускага Нацыянальнага К-ту. Бел. Нац. К-т, як ведама, складаецца з прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў і інстытуцыяў. Бел. Нац. К-т паводле рэгуляміну, якім кіруецца ў сваім унутраным жыцьці, кожны год абнаўляецца, — кожная арганізацыя ці інстытуцыя дэлегуе ў К-т або новых сваіх прадстаўнікоў, або дае паўнамоцтвы старым прадстаўнікам на наступны год. Абноўлены К-т выбірае і новы прэзыдыюм К-ту.

Вось-жа, згодна з рэгуляминам Бел. Нац. К-ту і традыцыяй мінулых гадоў, Прэзыдыюм Нац. К-ту на сваім паседжаньні дня 20 г. м. пастанавіў прыступіць да абнаўленьня К-ту і ў гэтай справе выдаў камунікат да беларускіх арганізацыяў і інстытуцыяў, які зьмяшчаем у гэтым нумары.

Беларускія касьцельныя сьпевакі ў вастрозе. Даведваемся, што Жодзішныя парахвіяне, сьпевакі беларускіх рэлігійных песьняў, Ст. Грыб і М. Ярмак, якіх суд засудзіў на кару вастрогу за т. е, што яны пяючы беларускія рэлігійныя песьні перашкаджалі ў польскім набажэнстве, адбываюць ужо кару ў Вялейскім вастрозе.

Такія справы, што канчаюцца судовымі працэсамі і вастрогам, у Жодзішнай парахвіі пачаліся ў часе „пастырства" там ведамага кс. Дроніча, які няміласэрна пачаў выкідаць з касьцёла беларускую мову. У часе найзаядлейшай барацьбы кс. Дроніча з беларус касьцяй здарыўся і такі выпадак, які быў прадметам для разгляду акружным і апэляцыйным судом, у галоўнай расправе каторага сам кс. Дроніч фігураваў як сьведка з боку пракуратуры. За дзейнасьць кс. Дроніча ў Жодзішках сусім слушна называюць яго парахвіяне жандарам у сутане.

З УСХОДНЯЕ БЕЛАРУСІ.

Ліквідацыя беларускай аўтокефальнай царквы. Газэты падаюць, што камуністычная ўлада прыступіла да ліквідацыі беларускай аўтокефальнай царквы, якая, быццам як беларуская, існавала ад 1924 году.

З Украінскага жыцьця.

Берасьцейскі вязень прад судом. У мінулым тыдні пачаўся ў Львове суд над б. украінскім паслом (УНДО) І. Лішчынскім. Акт абвінавачаньня закідае Лішчынскаму дзяржаўную здраду. Абвінавачаны да віны не прызнаўся і заявіў, што ён прайшоў у польскі Сойм па сьпіску УНДО, а гэтай партыі апошняй мэтай ёсьць — Незалежная Злучаная Украінская Дзяржава. Да сваей мэты гэтая арганізацыя ідзе дарогай легальнай. Суд над Лішчынскім прадаўжаецца.

Галадоўка ўкраінскіх палітычных вязьняў у Львове. Газэты падаюць, што 17 г. м. украінскія палітычныя вязьні, каля 50 асоб, якія сядзяць у львоўскім вастрозе, пачалі галадоўку. Яны дамагаюцца: 1) Хутчэйшага правядзеньня сьледзтва, 2) зьмены адносінаў турэмнай улады да іх, 3) аддзяленьня іх ад звычайных злачынцаў.

З Літоўскага жыцьця.

Пачаткавая асьвета ў Незалежнай Літве ў 1930-31 г. выглядае гэтак: усіх пачатковых школ — 2284, вучыцялёў — 4 тысячы, вучняў — 200.960. Апрача асьветы школьнай, шырока там разьвіваецца так-жа і асьвета зашкольная. Агулам асьвета ў Літве пастунае ўперад.

Касьцельная выстаўка. Сёлета ў Коўне будзе наладжана выстаўка рожных старадаўных касьцельных рэчаў, як касьцельная адзежа, пасуда, ліхтары, рэліквіяры, кнігі, званы, інструманты і т. д. Дзеля наладжаньня гэтай цікавай выстаўкі ёсьць ужо выбраны адумысловы камітэт, на чале з ведамым літоўскім вялікім паэтам пралатам Майронісам.

Кангрэс народнікаў 13 чэрвеня с. г. адбудзецца ў Коўне, на якім мае быць прысутных да 60 тысяч асоб.

Літоўскае выдавецтва ў Коўне за 1930 г. выглядае гэтак: Супалка „Фондас" выдала: 46 кніг, 6 журналаў, 9 рожных іншых друкаў; усяго 91 выданьне. „Дірва" выдала: 30 кніг, 7 журналаў, 16 рожных іншых друкаў; усяго — 53 выданьні. Таварыства сьв. Казіміра — 19 выданьняў. „Сакалас" — 32, Унівэрсытэт — 22, гаспадарчае выдавецтва — 65.

Літоўска-Эстонскае супрацоўніцтва разьвіваецца памысна ў ва ўсіх галінах грамадзкага жыцьця. У Коўне існуе адумысловы літоўска-эстонскі камітэт.

Лік гаспадарчых школ у Нез. Літве усьцяж узрастае. Сёлета паўсталі тры новыя гаспадарчыя школы: у Коўне, у Шаўлях і ў Таўрогах. Вучні, скончыўшыя гэтыя школы пераважна варочаюцца на свае ўласныя гаспадаркі.

* * *

Ад. Клімовіч.

Шляхам Незалежнасьці.

(Працяг, гляд зі „Бел. Кр." № 13 — 31 г.).

Вонкавыя абставіны важаць на лёсе народаў падчас вельмі цяжка. Тым ня менш кожны народ абавязаны разьвіваць сваю індывідуальнасьць, але павінен разам з тым і пачувацца сучасткай людзкасьці, „мусіць быць часткай цэласьці і кружыць каля яе, быццам плянэты каля свайго цэнтру".

Гэтак выглядае тэорэтычны падклад кожнага нацыянальна-вызваленскага руху. Практычны бок гэтага руху мае сваё абасnаваньне ў незапярэчаным праве кожнага народу па направы свайго лёсу, свайго жыцьця, паводле свайго ўласнага розуму. Ніводзін народ ня чуўся ніколі шчасьлівым у палітычным, ці якім іншым падняволеньні чужых народаў і ніводзін народ свае незалежнасьці ніколі дабравольна не мяняў на большую ці меншую залежнасьць. Затое праз усю гісторыю чырвонай ніткай ідзе бязупыннае змаганьне нават найменшых народаў за сваю незалежнасьць з тае простае прычыны, што толькі незалежнае існаваньне кожнага народу дае яму максымум духовых і матэрыяльных карысьцяў.

Ня трудна згэтуль зрабіць высnавак, што **адраджэнскі рух народаў**, маючых сваю мінуўшчыну, зьвязаных інтарэсамі сучаснасьці і імкнучыхся да супольнай і ясна азначанай мэты ў будучыні, ня ёсьць нейкім іхным капрысам, а толькі **лёгічным завяршэньнем гістарычна-эволюцыйнага працэсу, ёсьць нямінучай канечнасьцяй сусьветнай роўнавагі, сусьветнага міру.**

Гэтыя вывады, абаснаваныя на об'ектыўных навуковых досьледах, даюць паруку, што і Беларусы, маючыя ўсе пералічаныя прыметы ў мінуўшчыне і сучаснасьці, паміма ўсіх жудасьцяў і заломаў, могуць з значна большай пэўнасьцяй спазіраць наперад... Трэба толькі ўнармаваць, уадналастайніць **супольную мэту на будучыню.**

Беларускі нацыянальны ідэал Незалежнасьці, вызначаны актам з 25.III.18 г., зьдзейсьніцца мусіць. Гісторыя ня ведае йшчэ факту, каб адраджэнскі рух нейкага народу астанавіўся на поўдарозе. Пытаньне толькі часу: год пазьней, год раней. Але гэта сутнасьць справы толькі пацьвярджае. Лёгічнасьць грамадзкіх падзеяў, — калі яе тут наагул прызнаваць, — паказуе тое самае, а жыцьцяздольнасьць беларускай адраджэнскай думкі, ператрываўшай незраўнана горшыя часы, можа варажыць найлепшую будучыню, бо думка, стаўшыся словам, здольна перамагчы ўсякія перашкоды... і аружныя (Напалеон Бонапартэ) Трэба толькі, каб думка гэта абхапіла цэлы народ.

Пры канцы слоў пару што да сучасных бел. палітычных згрупаваньняў і іхных адносінаў да акту з 25.III.18 г. Згары трэба зазначыць, што асаблівая павага сяньняшняй урачыстасьці пазваляе толькі ў агульных рысах даткнуцца да гэтага вельмі дражлівага пытаньня.

З усіх сучасных беларускіх палітычных згрупаваньняў адны толькі камуністы сусём выразна і консэквэнтна нэгуюць, не прызнаюць, а паводле найнавейшых вестак і сурова прасьледуюць акт з 25.III.18 г. Ня так проста й выразна прадстаўляецца справа з іншымі згрупаваньнямі, сягоньня акт з 25.III.1918 г. прызнаючымі: тут далёка ня ўсюды можна правесьці беспрарыўную ідэолёгічную лінію. Памінаючы ўсе меншыя групы і групкі, нельга ўпусьціць з віду людзей з-пад сьцягу б. Грамады, перафарбаваўшыхся за ноч у „радыкалаў", ляпеных сяньня на ўлоньні сільных гэтага сьвету. Гэта інтэлігенская група, адарваная ад народнай гушчы, прайшла дзіўную мэтаморфозу і хто ведае, куды яшчэ яе лёс не закіне. Быў час, калі гэта група паваўзывала. За часоў нябошчыцы Грамады гэта самая група дaслоўна проста кпіла з усякага бел.-нацыянальнага пачуцьця і ягоных сымбаляў, а Сьвята 25.III.18 г. найвыразьней называла буржуазным і небеларускім. А сягоньня? Сягоньня ня хто іншы, як гэтая-ж група зрабіла новы паварот: псэўдо-нацыянальнай „помпай" ня кожны ім сягоньня дараўняецца, а апэтытамі перарасьлі гэтыя людзі самых сябе. І наш сягоньняшні ўрачысты сход, па мысьлі аднае меўшайся быць тайнай пастановы, мусіў быць імі праглынены. Жывём адвак. Спраўджаецца толькі лішні раз беларуская прыказка, што „смачны жабе гарэх..." Хай-жа будзе гэта і добрай прасьцярогай для кіраўнікоў бел. палітычнай і грамадзкай думкі ў будучыні, каб не выпераджалі жыцьця і не адрываліся ад нізоў, з каторых вышлі, бо стануцца лёгкай пярынкай, каторую жыцьцё нясе, куды толькі павее вецер.

На заходніх беларускіх землях адзінай арганізацыяй беспрарыўна вернай ідэалу Незалежнасьці па мысьлі акту з 25.III.18 г. ёсьць Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні, які традыцыйна, з году ў год, а сёлета

Зьезд літоўскіх вучыцялёў у Вільні адбыўся 11 г. м. На зьезьдзе было прачытана некалькі рэфэратаў. Галоўная мэта зьезду — справы арганізацыйныя літоўскага вучыцельства. Праз увагу на тое, што польскі ўрад, зачыніўшы ў сваім часе літоўскую вучыцельскую сэмінарыю ў Вільні, адчыніць яе нанова не згаджаецца, — зьезд пастанавіў арганізаваць самапомач, каб зрабіць больш даступным для літоўцаў вучыцельскія кваліфікацыі.

Літоўскае Навуковае Т-ва сёлета працуе пераважна над бібліятэкай. Дагэтуль запісана ў каталёг да 9 тысяч кніг, а запісаных толькі ў інвэнтар да 8 тысяч кніг. Упарадкаваны так-жа кmasплеты розных часопісяў і архіўныя дакуманты.

Т-ва „Рытас“ паслала ў соймавую камісію мэмор'ял аб школьных патрэбах.

Студэнтаў літоўцаў у Віленскім унівэрсытэце знаходзіцца 73, усе яны арганізаваныя ў сваю ўласную студэнскую арганізацыю.

Літоўскі Коопэратыўны Банк у мінулым тыдні адбыў сваё гадавое сабраньне. На сабраньні гэтым абгавораны справы арганізацыйныя банку, а так-жа выбраны новы ўрад. Банк разьвіваецца памысна.

З Польшчы.

Кароткая сэсія Сойму. Прэзыдэнт Польшчы дня 19 г. м. выдаў дэкрэт, каторым склікае сэсію Сойму і Сэнату дзеля разгляду ўрадавага праекту закону аб чыгуначнай пазычцы.

Сойм мае сабрацца на паседжаньне 23 г. м.

Гэтая сэсія патрывае вельмі коратка, бо мае разглядзець толькі адну справу. Зрабіўшы сваё, паны паслы разьедуцца хто куды і будуць чакаць, пакуль урад прыгатуе штось другое да „работы“ парляманту.

З заграніцы.

Канец манархіі ў Гішпаніі. Як мы падавалі ў прошлым нумары, гішпанскі кароль Альфонс XIII адрокся ад прастолу. А сталася гэта дзеля таго, што ў выбарах у самаўрады перамаглі тыя партыі, якія настроены праціў манархічнага строю. Кароль, пабачыўшы сваю слабасьць у народзе, сам адрокся ад трону і выехаў заграніцу.

Пасьля зрачэньня караля ад прастолу ў Гішпаніі абвешчана рэспубліка. Законы новай гішпанскай рэспублікі прызнаюць прыватную ўласнасьць, свабоду сумленьня і рэлігіі.

Гішпанская манархія, якая трывала праз 15 стагодзьдзяў, упала ў працягу 15 гадзін і не хацелі яе падтрымаць ані Царква (Касьцёл) ані армія. Словам, аджыла свой век да глыбокай старасьці.

Новыя самастойныя рэспублікі — Каталёнія і Арагонія. На разваліках гішпанскай манархіі паўсталі, апрача гішпанскай, дзьве новыя самастойныя рэспублікі: Каталёнія і Арагонія.

Каталёнія—гэта невялікая краіна, якая налічвае 2.300.000 насяленьня, памешанага расова, паложавае ў паўночна-ўсходнім кутку Гішпаніі з сталіцай Барцэлёна.

Арагонія ёсьць суседкай Каталёніі ў паўночнай Гішпаніі, пад Пірэнэямі. Гэтая краіна амаль пустынная ад недахопу дажджоў; на абшары 47.391 кв. кілём. налічвае яна толькі адзін мільён насяленьня. Арагонія ў 12—15 стагодзьдзі разам з Каталёніяй была незалежнай дзяржавай. У 1469 годзе пасьля злучэньня Арагоніі з Кастыліяй паўстала гішпанская дзяржава. Сталіца Арагоніі — Сарагосса.

Як бачым, Гішпанія пасьля ўпадку манархіі пачынае разваліваццa. Сучасная гішпанская рэвалюцыя зусім падобная да рэвалюцыі Керэнскага ў Расеі, пасьля каторай можна спадзявацца рэвалюцыяў соцыяльных.

Украінскія скаргі на міжнароднай арэне. Камісія Лігі Народаў дзеля спраў народных меншасьцяў — „Камітэт Трох“ прыступіў да разгляду ўкраінскіх скаргаў на Польшчу за „пацыфікацыю“ у Усх. Галіччыне. Дня 16 г. м. „Камітэт Трох“ у Лёндане, разглядзеўшы ўкраінскія скаргі і польскія высьненьні, пастанавіў зьвярнуцца да польскага ўраду, каб ён паў дапаўняючае выясьненьне ў гэтай справе. Наступнае паседжаньне „Камітэту Трох“ адбудзецца пасьля атрыманьня з Польшчы патрэбаванага выясьненьня.

Міжнародная арганізацыя мэталёвага промыслу. У Бруксэлі адбыўся зьезд прадстаўнікоў мэталёвага промыслу з 12 дзяржаў, у гэтым ліку: Англіі, Нямеччыны, Швэцыі, Чэхаславаччыны і інш. Зьезд прызнаў, што нямецка-аўстрыйскі мытны саюз зьяўляецца першым крокам дзеля наладжаньня гаспадарчых адносінаў Эўропы.

Калыханка.

Роднаму Дзімачцы замест Вялікоднае пісанкі прысьвячае Дзядзька Сяргей.

За лесам сонейка касулі
Схаваліcь, каб назаўтра ўстаць.
Сьпі, мой сыночак!—люлі, люлі!
Я цябе буду калыхаць!

Прачнесься заўтра ты й з матуляй,
Ізноў будзеш весяла гуляць.
Засьні-ж, анёлак! — люлі, люлі!
Я буду ўсьцяж табе пяяць!

У лесе птушачкі паснулі,
Сваіх больш песьняў не пяюць.
Сьпі-ж, Дзімачка мой!—люлі, люлі!
Пара й табе ужо заснуць!

Бач—ў небе зорачкі блiснулі,
Адтуль на нас яны глядзяць.
Сьпі-ж, Дзімачка мой!—люлі, люлі!
Пара табе, сыночак, спаць!

Пільнуе сон твой ўраз з матуляй
Анёлак Божы, Сторож твой!
Сьпі-ж сьмела, сынку!—люлі, люлі!
Сьпі, Дзімачка, маленькі мой!

Сяргей Пяюн.

зьяўляецца гаспадаром 13-тых ужо угодкаў Абвешчаньня нашай Незалежнасьці. Мы сяньня з беспасярэднай блізкасьці мо' не патрапімо належна ацаніць важнасьці беспрарыўнай палітычна-незалежніцкай лініі, якую вядзе Бел. Нац. Камітэт. Зробіць гэта ў належнай меры гісторыя. Гісторыя таксама ацэніць, як сьпелай аказалася палітычная лінія Бел. Нац. К-ту ў 13-тым годзе нашага змаганьня за Незалежнасьць, годзе, дамарослымі варажбітамі названым „чорным“, — годзе, у каторым пераможаны былі юдашоўскія пакусы парваць нашую адвечную лучнасьць насамперш з братнім народам украінскім, а пасьля і літоўскім. Бел. Нац. К-т гэту спакусу перамог і з пагардай адкінуў. Гісторыя і ўвесь Беларускі народ, які ніколі не дапусьціць да абарваньня супольнага фронту Беларусоў, Украінцаў і Літоўцаў, заўсёды належна ацэняць усякі крок, які будзе гэты фронт не расслабляць а замацоўваць.

Калі можна выразіць пажаданьне для працы Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў наступным годзе, дык ім будзе пажаданьне каб ня ўхіляючыся ад супрацоўніцтва з кожным чалавекам добрай волі і кожным народам, і далей, як дагэтуль, вёў пасьвячоную вякамі гістарычную лінію беларускай палітыкі рачовага, на самазразуменьні абапёртага, беларуска-літоўска-украінскага супрацоўніцтва.

Тудою толькі наш шлях да Незалежнасьці...

Вільня, 25-га сакавіка 1931 г.

Ab haspadarcy.

Na što i jak hnaić.

Jak sam nazoŭ užo pakazuje, štučnyja hnai źjaŭlajucca dapaŭnieńniem hnajoŭ naturalnych, vyrablanych u samaj haspadarcy. Hałoŭnaj rysaj, adrožnivajučaj štučnyja hnai ad naturalnych, jość ichny skład. Padčas kali ŭ hnajoch naturalnych, choć u małoj častcy, ale jość bolš-mienš usie składovyja karmavyja sučastki: azot, fosfar, pataš i vapna, u štučnych hnajoch znachodzicca z pieraličanych składovych sučastak tolki adna. Zaležna ad hetaha štučnyja hnai byvajuć azotnyja, fosfarnyja, patašavyja i vapiennyja. Ličba, ci lepš — forma, u jakoj štučnyja hnai spatykajucca ŭ prodažy, jość nieahraničanaj i štoraz pavialičyvajecca. Najbolš raspaŭsiudžany hetyja štučnyja hnai: z azotnych — čylijskaja saletra, azotniak, sierka-amonnaja sol, „Nitrofos“ (azotna-fosfarny hnoj), z fosfarnych — superfasfat i tamasšlak, z patašavych — patašavaja sol i kainit i z vapiennych — vapna. Kožny hatunak nazvanych hnajoŭ maje svajo praznačeńnie: z azotnych hnajoŭ raścina buduje svajo „zialonaje raścinnaje miasa“, fosfarnyja hnai śpielać raścinu, patašavyja — pamahajuć raścinie ŭ pracy pry vytvarańni krachmału, vapiennyja ŭreščie — dajuć raścinie kaściak (škialet).

Choć kožny z pieraličanych štučnych hnajoŭ moža być užytym na kožnaj hlebie, to-ž adnak radziać padzialić heta ŭžyvańnie ŭ zaležnaści ad hleby—lohkaj ci ciažkoj. Na lohkich hlebach radziać užyvać z azotnych hnajoŭ: azotniak i ŭsie inšyja, z fosfarnych — tamasšlak, z patašavych — kainit, a na ciažkich hruntach: z azotnych — saletru i ŭsie inšyja, z fosfarnych—superfasfat, z patašavych — patašavuju sol i z vapiennych — na kožnuju hlebu patrabujučuju vapny (hdzie rastuć usiakija kisłyja travy, jak asaka, ščaŭjo, gugiel i inš.) — dać vapna.

Pry siańniašnim haspadarčym kryzysie nielha na ślepa radzić užyvańnia štučnych hnajoŭ, bo heta nie zaŭsiody apłacicca. Ahułam tolki možna skazać, što pad zbažžaviny treba dadavać štučnych hnajoŭ azotnych i fosfarnych, a pad akopniny — pieradusim patašavych i azotnych. Zasiavajucca štučnyja hnai abo—kožny paasobku, abo źmiašanyja razam. Miašać adnak nielha: 1) superfosfatu z azatniakom, vapniakovaj saletraj, tamasšlakom i vapnaj, 2) sierkaamonnuju sol z azotniakom i vapnaj, 3) tamasšlaka z sierkaamonnaj solaj a amonnaj saletraj. Kainit, patašavuju sol i čylijskuju saletru možna prad zasievam miašać z kožnym štučnym uhnajeńniem. Pry vysieivańni štučnych uhnajeńniaŭ treba miarkavać, kab čas byŭ biazvietrany, a pry hnajeńni „na list“ — i suchi, biez rasy i doždžu. Kožny štučny hnoj musić być bolš-mienš pieramiašany z hlebaj (prybaranavany). Niekatoryja hnai dajucca nadoŭha pierad siaŭboj; napr. kainit dajecca na viasnu, jak tolki sojdzie śnieh. Padobna i tamasšlak. Inšyja ŭznoŭ, jak azotniak, dajucca za tydzień prad siaŭboj, abo prad samaj siaŭboj (superfosfat i čylijskaja saletra), ci ŭreščie pa ŭzyšoŭšym užo zbožžy (čylijskaja saletra, „Nitrofos“ i azotniak).

Kuplajucca i ceniacca štučnyja hnai pavodle pracentu samych hnojnych sučastak. Treba adnak zapeŭnicca, ci pakazany pracent hnojnych sučastak u danym parašku sapraŭdy znachodzicca. Dziela taho, što kuplajučy adzin — druhi pud štučnych hnajoŭ, paruku takuju dastać trudna (doraha), štučnyja hnai treba kuplać zmoviŭšysia z susiedziami całymi vahonami. „Na zapas“ hnajoŭ kuplać nia radziać, bo ad niaŭmiełaha pierachavańnia (ad vilhaci) jany časta źbivajucca ŭ kamieńni. Ureščie treba zaciemić, što štučnyja hnai apłačyvajucca tolki na hruntoch dobra abroblenych, a hałoŭnaje — ašušanych ad nadmiernaj vilhaci.

Inž. *A. K.*

З Вільні.

Паводка. Вялья штораз падымаецца і ў некаторых мясцох вылілася і заліла вуліцы.

Камуністы дэманструюць. У мінулую нядзелю камуністы па завулках м. Вільні параскідалі свае праклямацыі і ў мясцох наказалі чырвоныя сьцягі. Паліцыя арыштавала 20 падросткаў, на якіх і трымаецца ўся камуністычная прапаганда ў нашым краю, і пасадзіла іх у вастрог.

З краю.

Нёман выліваецца з берагоў. З прычыны ледзяных запораў на дольным Нёмане і напору вады з гары, Нёман у Горадні выліўся з берагоў і затапіў пабярэжжа.

Пажары. У апошнія часы: у Лідзе згарэў піўны бровар Шокэна, у м. Глыбокім урад скарбовы, які быццам нехта сумысла падпаліў, у м. Мядзяле згарэла 6 дамоў.

Лавіў рыбу і ўтапіўся. У мінулую нядзелю, плаваючы на чаўне па рацэ Мэрачанцы каля Гарадка, Маладэчанскага пав. Г. Чарэшка лавіў рыбу. Раптам перавярнуўся човен і Чарэшка ўтапіўся.

Сьвіньні адкапалі трупа хлопчыка. У в. Заельнікі, Парафіянаўскай гм. Дзісьненскага пав. з жад сьвірна выцягнулі труп маладога хлопчыка. Паліцыя ў гэтай справе, каб выкрыць забойцаў, вядзе сьледства.

Да нас пішуць:

ВОН СЭКТАНТАЎ!

Вялікая Быхаўшчына, Нясьвіскага пав. Каля нас, таксама як і па ўсей Беларусі, пачалі круціцца розныя сэктанты. Сэктай называецца новы кірунак рэлігійнай думкі, які адкідае адзін або некалькі догматаў і заводзіць новыя формы абраднасьці. Тыя, каторыя ня хочуць прызнаваць праваслаўя або каталіцкасьці, выдумоўваюць новую веру і гэту сваю веру стараюцца пашырыць па сьвеце. Кожная сэкта заяўляе перад усім, што яна толькі мае праўду, толькі яе вызнаўцы справядлівыя і добрыя людзі, для якіх прыгатоўлена царства нябеснае. А ўсе іншыя — гэта людзі нягодныя, служкі д'ябла і яго цёмнага царства.

Яшчэ нядаўна ў Нясьвіскім павеце была „адна Беларусь“, яшчэ да 1925 году была адна беларуская палітычная ар'ентацыя, потым-жа натварылася многа палітычных сэктаў з „прарокамі“ на чале, якія распарцэлявалі нашае грамадзкае жыцьцё і грамадзкую думку. Цяпер-жа хочуць розныя „дабрадзеі“ распарцэляваць і нашую рэлігійную думку і ўвясьці яшчэ больш разлад у беларускае жыцьцё. Дагэтуль у беларускім народзе было толькі праваслаўе і каталіцтва, а цяпер зьяўляюцца розныя баптысты і іншыя, якія яшчэ болей хочуць падзяліць і пасварыць наш народ.

На мой пагляд, ужо многа шкоды прыносіць падзел беларусаў на каталікоў і праваслаўных, мясцамі яны нават ня любяць адны другіх, што прыносіць многа шкоды нашаму народнаму адраджэньню, бо бывае так, што каталік называе сябе „польскай“ веры і цягне ў Варшаву, а праваслаўны называе сябе „рускай“ веры і цягне ў Маскву. Дык нашто нам яшчэ адзін падзел — ды не адзін, а некалькі? Бо калі беларусы падзеляцца яшчэ на баптыстаў, мэтадыстаў ці якіх там іншых сэктантаў, то распарцэлююць і рэлігійную думку, так як распарцэлявалі грамадзкую і пачнуць адны адных грызьці. І нашто гэта здалося? Да чаго гэта давядзе?

Дык у імя еднасьці беларускага народу трэба змагацца з сэктанскай заразай. Калі гэтыя „пракокі“ зьявяцца ў вёску, трэба іх гнаць вон, браць мятлу і вымятаць гэтую заразу. Вон з беларускай зямлі розныя сэкты! — гэта павінен быць кліч кожнага сьведамага беларуса.

Беларус.

АБ ЖЫЦЬЦІ У МАЛАДЭЧАНСКІМ ПАВЕЦЕ.

Гаспадарчае палажэньне Маладэчаншчыны. Сялянскія гаспадаркі нашага павету, большасьці якіх абшар не перавышае 5 дзесяцін, абцяжаныя сем'ямі ад 7 да 10 асоб. Да гэтае пары сяляне на сваіх камяністых вускапалосных гаспадарках жылі сяк-так, бо былі пабочныя заработкі, якія зьяўляюцца неабходнымі для сялянскай сям'і на такой куртатай рольнай гаспадарцы. Цяпер-жа гэтых пабочных заработкаў нястала і пачало заміраць у вёсцы жыцьцё.

Сучасны стан сялянскіх гаспадарак вымагае безадкладнай рэформы, бо яны ўжо няздольныя нават пракарміць тых сем'яў, якія спрадвякоў зжыліся з земляробствам і каторых адзіным варштатам працы ёсьць сялянская гаспадарка. Прырост насяленьня без адпаведнай рэформы рольнай у працягу доўгіх дзесяткаў гадоў раздрабіў сялянскія гаспадаркі да такіх разьмераў, што яны сталіся няздольнымі нават самастойна ўтрымацца. Побач-жа з драбязой гаспадарак сялянскіх мадзеюць так-жа і з вялікімі абшарамі двары, якія земляробскай культурай анічуць не перавышаюць вускапалосістыя гаспадарачкі сялянскія. Вялікія двары стогнуць ад вялікіх падаткаў і таннасьці збожжа, а сялянскія сем'і на маларольных гаспадарках стогнуць ад недахопу земляробскай прадукцыі з сваіх гаспадарак. З гэтага ясна, што нават само жыцьцё вёскі змушае да неадкладнай рэформы рольнай — рэформы справядлівай, надзелу сялянскім сем'ям зямлі на ўласнасьць.

П.

Закон. в. Асташкі. Вёска стогне ад бяды, а закон сваё дзела правіць. Ці ёсьць з чаго ці няма — падаткі плаціць трэба, бо закон такі.

Не заплаціш у пару, закон прымусіць заплаціць і яшчэ пакарае за спазьненьне.

Ёсьць у нашай вёсцы вельмі бедная сям'я, якая ледзь сяк-так пражывае, а аб падатках дык і гаварыць няма чаго. Але закон сваё робіць, кажа плаціць і квіта. Гэтая сям'я ня сплачвала падаткаў дабравольна, бо ня мела чым плаціць, а сэквэстратар прыехаў і па закону апісаў каня за падаткі.

Але-ж закон кажа таксама, што даецца права кожнаму чалавеку, каб ён мог жыць і нават багацець. Тымчасам выходзіць, што быццам гэты-ж закон дзеіць наадварот. А гэтаму дык вінаваты мы самі, што няўмела або і сусім не карыстаем з таго закону, якім маглі-б бараніць сваю справу. Калі адбываюцца якія выбары ў інстытуцыі, каторыя выдаюць законы, мы на гэтыя выбары або ня йдзём сусім, або галасуем за тых людзей, якія аб нас ніколі і непадумаюць. А гэтаму вінавата наша цемната і неарганізованнасьць. Мы ў выбарах заўсёды давяраем сваю справу таму, хто найсаладзей гаворыць, самі-ж аб гэтым падумаць не патурбуемся.

Дык карыстаймася з законаў — арганізуймася і творым сваю народна-беларускую сілу.

А.

Не пагарджайма сабою! в. Румянцэва. Цяжка плыве нашае жыцьцё каля нас. Людзі забіты горам і недастаткам матэр'яльных і духовых патрэб. Нацыянальная сьведамасьць даволі пруткая, хоць знаходзіцца пад вялікай „апекай“ старажоў яе прабуджэньня. У гэткім стане жыцьця здараюцца вельмі сьмешныя зьявішчы. Вось адзін сьмешны факцік. Янычка Б., пабыўшы на курсах гаспадарчых, замест чаго сь навучыцца, „забыўся“ сусім роднай мовы. Ня ведае бедны, як і бацьку роднага называць, замест папярэдняга назову „тата“, называе цяпер „пане ойцец“.

Браты, закладайма свае беларускія культурна-прасьветныя арганізацыі, праз якія здолеем пашырыць і паглыбіць нашую нацыянальную сьведамасьць і выкінуць з абдурманеных галоў асьмяшаючы нас стыд свайго роднага. Стыдна выракацца роднай мовы, бо хто стыдаецца сваей бацькаўскай мовы, той выстаўляе на пагарду самага сябе.

Г. П.

НЕ МАРНУЙМА ДАРМА ЧАСУ!

Іказьнь, Браслаўскага пав. Наракаюць людзі на свой лёс, а каб пастарацца яго паправіць, дык кажуць — няма часу. Ведама, што найлепшым прыяцелем гора, дык гэта цемната. Дзеля гэтага, змагаючыся з горам, у першую чаргу трэба змагацца з цемрай. А каб перамагчы цемру, трэба прасьвячацца. Каб хоць крыху прасьвяціць нашую вёску, трэба выпісываць свае родныя газэты, арганізаваць гурткі культурна-прасьветных арганізацыяў, адкрываць бібліятэкі чытальні і пашыраць у народзе родную кніжку. Але на гэта многія вяскоўцы адказваюць — „няма часу“. Тымчасам гэты-ж самы час нашы людзі марнуюць часта на пустую балтаўню, сабраўшыся ў адну хату, або ігрой у карты.

Дарагія браты, асабліва моладзь, не марнуйма дарма часу на пусьцячыну і выкарыстайма яго для дабра свайго і нашага беларускага народу — выкарыстайма гэты час на прасьвету. Не спадзяваймася, што нехта нам паправіць лёс. Не, такіх „прыяцеляў“ на сьвеце няма. Наш лёс мусім паправіць мы самі. Дык працуйма самі над сабой, а праз гэта паправім свой і нашага народу лёс.

Р.

НЕДАЦЭННАСЬЦЬ НАВУКІ.

Жалудак, Шчучынскага пав. Наша вёска яшчэ цёмная і трэба над ёй шмат працаваць. Заглянуўшы ў газэты здаецца, што ўсе людзі жывуць культурна і карыстаюцца здабыткамі навукі. А як глянеш на жыцьцё нашага сялянства, дык здаецца, што і сусім нідзе няма ніякае культуры, як кажуць 20-га веку, бо вёска наша жыве прымітыўным яшчэ жыцьцём. Прыкладам, у галіне мэдыцыны дык нашая вёска нават і ня ведае, што тут патрэбная навука. Вучоных дактароў у нас заступаюць знахары. І найбольш сумна, што людзі нашы знахарам вераць, а дактарам навукі не давяраюць.

Дзіўна і вельмі дзіўна, што ўлады, якія кіруюць прасьветай, ня кіруюць ёй так, каб нашы людзі прасьвячаліся, а толькі, каб умелі расьпісацца і чытаць папольску.

Тут трэба шырэйшай працы над народам. А каб яна сапраўды была працай прасьветнай, трэба яе весьці пабеларуску, бо народ толькі па свойму зразумее, аб чым яму кажуць вучоныя.

Б.

Усячына.

Чаго ня мае права забраць сэквэстратар? Паводле закону сэквэстратар ці каморнік судовы ня мае права апісаць наступных рэчаў:

1) Адзежы, ложкаў, бялья, хатніх рачэй, якія ёсьць неабходныя для сям'і даўжніка.

2) Прадуктаў і апалу, патрэбных даўжніку на 14 дзён з сям'ёй.

3) Запамогі, якую даўжнік атрымаў з прычыны якогась няшчасьця ў гаспадарцы (асэкурацыя і г. д.)

4) Рэчаў, якія зьяўляюцца часьцінамі варштату працы даўжніка.

5) Грошай, якія даўжнік атрымаў ад дабрадзейных інстытуцыяў.

6) Шлюбных пярсьцёнкаў, кніжак да набажэнства, сямейных партрэтаў і школьных падручнікаў.

Колькі ёсьць у Польшчы сэктаў рэлігійных? Усіх рэлігійных сэктаў у Польшчы налічваецца аж 19. Найбольшыя: Гадураўцы (польскі народны касьцёл каталіцкі), Мар'явіты (або Казлавіты), Дасьледчыкі сьв. Пісьма, Адвэнтысты, Спірытысты, Баптысты, Анабаптысты і Мэтадысты. Усе сэкты маюць разам каля 80.000 сваіх паклоньнікаў. Адных Гадураўцаў налічваецца 50.000. Гэтая сэкта найлепш зарганізаваная, яна мае свайго „біскупа“, 50 „ксяндзоў“, сэмінарыю ў Кракаве і каля 50 парахвіяў. Мар'явітаў ёсьць каля 5.000. Дасьледчыкаў сьв. Пісьма так-жа каля 5.000. Спірытыстаў налічваецца каля 3.000. Адвэнтыстаў так-жа каля 3.000.

Забастоўкі ў Польшчы. У 1930 годзе ў Польшчы было 286 забастоўкаў, страйкавала 44.317 работнікаў. У выніку змарнавана 329.269 рабочых дзён.

У Эўропе ёсьць яшчэ 11 манархаў: Англія, Альбанія, Бэльгія, Баўгарыя, Данія, Галяндыя, Югаславія, Монако, Нарвэгія, Швэцыя і Італія.

Наша пошта.

Купрыновічу. У справе гандлю найлепш дагаварыцца з якой небудзь большай фірмай на месцы ў Маладэчне, бо з незнаёмай фірмай у Вільні аб дагодных варунках справа труднейшая. Атрымаўшы грошы газэту і календар вышлем.

Беларусу з Шастакоў. Атрымалі, дзякуем, у наступным нумары скарыстаем.

Вількоўшчыку. Атрымалі, дзякуем. Крытыка ўжо гатова, астаецца толькі выслаць, скора вышлем.

Уніту. Усяго на пробу пасылаць ня можам, бо і сама перасылка каштуе, а ў нас з грашмі так-жа трудна, бо мы грошы атрымліваем толькі ад нашых падпішчыкаў.

Грошы атрымалі ад: кіраўніка Варшаўскай палітэхнікі 4 зл. Бурдукевіча 3 зл., „Рух“ 3 зл., Б. Вілкойця 4, 70. Стэпанэля 2 зл., Уміта 1 зл. і Саковіча 1 зл.

Zabłociskamu Biełarusu. Prośbu Wašu spoŭnili. Praŭnaja parada woś takaja: — Taho dakumantu, dziakujučy palitycnym adnosinam miž Polščaj i Litwoj, dastać wielmi trudna, a nawat i niemahčyma. Ale jon Wam i nia tak mocna patrebny, bo tady jašče sud — (źjezd) pawodle daŭnaści pryznaŭ prawy pa Wašaj staranie, dyk ciapier tym bolej, bo ad taho času jašče adzin termin daŭnaści prajšoŭ. Tolki Wy z swaim praciŭnikam nijakaj uhody nie rabicie i nie dapuskajcie jaho da supolnaha ŭładańnia majemaściaj. Z karespandencyi skarystajem.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Засноўвайце гурткі Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры! Дзе ёсьць хоць трох сьведамых беларусаў жадаючых працаваць на ніве культурнага і гаспадарчага адраджэньня Беларусі, там павінен быць гурток Інстытуту.

Выпісвайце статут, інструкцыі і пачынайце арганізацыйную працу!

Адрас Інстытуту: Вільня, Людвісарская вул. 1—19.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч